# Час подзвігу, час трагедыі

**Да 100-годдзя з дня нараджэння В. Г. Кнорына**

ГІСТОРЫЯ ЖЫВЕ Ў ЛЮДЗЯХ

Нарадзіўся В. Г. Кнорын 17/29 жніўня 1890 г. у Латвіі на арандуемым бацькамі хутары Цыелі Скуенскай воласці Цэсіскага павета Ліфляндскай губерні.

У 1910 г. Вільгельм заканчвае настаўніцкую семінарыю, наладжвае сувязі з рэвалюцыйным сацыял - дэмакратычным гуртком на Лігатнскай папяровай фабрыцы, які ўзначальваў бальшавік Карл Ілмерс.

1 мая 1910 г. гурткоўцы прынялі В. Г. Кнорына ў бальшавіцкую партыю.

Затым В. Г. Кнорын пераязджае ў Рыгу. Палітычна завостраныя, цесна звязаныя з тагачасным грамадскім жыццём артыкулы, лекцыі Вільгельма Георгіевіча ў легальных і паўлегальных таварыствах прыцягнулі ўвагу не толькі таварышаў па барацьбе, але і паліцыі. Яго напаткаў бы лёс многіх іншых барацьбітоў, калі б не грымнула першая сусветная вайна, якая кінула заўзятага «ниспровергателя устоев самодержавия» ў акопы Заходняга фронта.

В. Г. Кнорын наладжвае сувязі з таварышамі, што былі вядомы яму па Латвіі, прымае ўдзел у рабоце партыйнай ячэйкі, якую ўзначальваў К. І. Ландэр, а неўзабаве і сам стварае ў 32-м эвакуацыйным пункце бальшавіцкую групу.

У ноч на 2 сакавіка 1917 г. Мінск абляцела вестка аб падзенні царскай улады. В. Г. Кнорын прымае ўдзел у стварэнні Мінскага Савета, уваходзіць у яго выканком.

Летам 1917 г. бальшавікі стварылі Мінскі Камітэт РСДРП(б) на чале з А. Ф. Мясніковым. У яго ўвайшоў і В. Г. Кнорын.

Для пашырэння ўплыву рэвалюцыйных ідэй сярод салдацкіх мас патрэбна была свая бальшавіцкая газета. В. Г. Кнорын разам з М. В. Фрунзе, А. Ф. Мясніковым ствараюць яе, пераадольваючы цяжкасці з паперай, шрыфтам, друкарняй. Як назваць газету? Патрэбна была палымяная, натхняючая назва. Былі прапановы назваць яе Заходняй ці Франтавой Праўдай, але гэта пагражала хуткім закрыццём, бо супадала з ліпеньскім пераходам Часовага ўрада ў наступленне супраць бальшавікоў і іх цэнтральнага органа газеты «Правда». Таму было вырашана даць газеце бальшавікоў Заходняга фронта, як пісаў В. Г. Кнорын, імя славутай папярэдніцы «Правды» — «Звезда». Газета выйшла 27 ліпеня 1917 г. і прыйшлася да спадобы рабочым, сялянам і салдатам. Усякае было: не ставала грошай, паперы. Часовы ўрад неаднаразова закрываў яе, але газета зноў адраджалася, адказвала на самыя надзённыя пытанні жыцця, абнадзейвала, падтрымлівала ў бядзе. В. Г. Кнорын узначальваў у рэдакцыі аддзел унутранага і замежнага жыцця, даводзілася быць і выпускаючым, і фальцоўшчыкам. Але перш за ўсё —аўтарам.

25 кастрычніка 1917 г., апоўдні, бальшавікі Мінска атрымалі вестку аб перамозе сацыялістычнай рэвалюцыі ў Петраградзе. В. Г. Кнорын, у той час намеснік старшыні Мінскага Савета, разам з іншымі членамі Прэзідыума падрыхтавалі загад аб пераходзе ўсёй улады ў рукі Саветаў.

У лютым 1918 г. В. Г. Кнорын з'яўляецца старшынёй Мінскага камітэта РСДРП(б). Калі ўзнікла пагроза наступлення германскіх войск, Кнорын фарміруе партыйнае падполле, працягвае кіраўніцтва ім са Смаленска, куды эвакуіраваўся разам з савецкімі і партыйнымі ўстановамі. Працуе ваенным камісарам ваеннай акругі, сакратаром абласнога камітэта партыі, рэдагуе газеты «Звезда», «Бедняк». Яго сёстры Мільда і Зельма расказвалі аўтару гэтых радкоў, што Вільгельма Георгіевіча амаль немагчыма было «злавіць» у кабінеце, ён заўсёды знаходзіўся сярод людзей —імкнуўся жыць іх настроямі і надзеямі, разам вырашаць складаныя пытанні барацьбы. Адно з іх — рэалізацыя «Дэкларацыі правоў працоўнага і эксплуатуемага народа» і самавызначэнне беларусаў. Пытанне наспела. В. Г. Кнорын гэта адчуваў яшчэ па падзеях снежня 1917 года, калі ў Мінску быў распушчаны так званы Усебеларускі з'езд. Ён проціпаставіў сябе Савецкай уладзе. Пэўная частка нацыянальнай інтэлігенцыі удзельнічала ў рабоце з'езда, насуперак волі беларускага народа дамагалася буржуазнага самавызначэння Беларусі. В. Г. Кнорын, А. Ф. Мяснікоў, К. І. Ландэр, іншыя кіраўнікі, ведаючы сапраўдныя спадзяванні працоўных, у той жа час недаацэньвалі іх імкненне да ўтварэння Савецкай Беларусі як суверэннай дзяржавы. Яны лічылі, што надзеі беларускага народа, у сувязі з этнічнай, культурнай, духоўнай блізкасцю да рускага народа, могуць быць у поўнай меры рэалізаваны ў рамках РСФСР, куды беларускія землі ўвойдуць у якасці абласной тэрытарыяльнай адзінкі. Такі памылковы падыход супярэчыў ленінскім палажэнням аб неадкладным адналенні поўнай свабоды як для Фінляндыі, Украіны, так і для Беларусі, у чым прадстаўнікі абуджанага сацыялістычнай рэвалюцыяй беларускага нацыянальнага руху бачылі ўшчамленне сваіх правоў. Больш таго, В. Г. Кнорын, многія іншыя бальшавікі, нават з цэнтра, у практычнай рабоце кіраваліся таксама памылковым успрыманнем палажэнняў аб самавызначэнні народаў. У артыкуле «Самавызначэнне народаў і дыктатура пралетарыяту», надрукаваным у «Звяздзе», В. Г. Кнорын

М. КУЗНЯЦОЎ,
старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП Беларусі, доктар гістарычных навук.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы